*І.І.СУЧКОЎ*

# УЗОРЫ КАЛЕКТЫЎНАГА ПАДСВЯДОМАГА Ў ФАЛЬКЛОРНЫМ ТЭАТРЫ БЕЛАРУСАЎ

Вобразы і сімвалы спантаннай творчай энергіі (архетыпы) – найбольш старажытныя і ўсеагульныя формы ўяўленняў чалавецтва, якія існуюць у розных рас і народаў. Назіранні за вобразамі фальклорнага тэатра яскрава сведчаць, што такія сімвалічныя формы сустракаюцца і ў духоўнай культуры беларусаў. Псіхолагі заўважылі, што ў вобразах і сімвалах спантаннай творчай энергіі "знаходзяцца адлюстраваныя, змешчаныя ў калектыўнай псіхіцы, штучна ўсвядомленыя або зразумелыя праз пачуцці *апазіцыі, пары* (курсіў наш. – *І.С.*) маральных супрацьлегласцей" [16, с. 206]. Такія апазіцыі, або пары маральных супрацьлегласцей, уласцівыя і персанажам фальклорнага тэатра беларусаў. Тут і *высокае – нізкае, і прыгожае – нязграбнае, і вясёлае – сумнае, і добрае – злое*, і інш. Такіх персанажаў фальклорнага тэатра беларусаў можна параўнаць з героямі фальклору іншых народаў (рускіх, якутаў). "Дыялектыка прыгожага і непрыгожага ў вобразах ідэальнага героя, – піша В.Гусеў, – складана адлюстраваная ў некаторых эпічных вобразах, безумоўна, старажытнага паходжання" [6, с. 277]. Калі звярнуцца за прыкладамі, скажам, да беларускіх казак, асабліва аб жывёлах, то можна ўбачыць, што адзін і той жа персанаж вельмі часта мае і велізарную дабрачыннасць, і шматлікія заганы. З такімі персанажамі можна пазнаёміцца і ў іншых з'явах фальклорнага тэатра. Напрыклад, Яшчур-паночак у аднайменнай каляднай гульні (вядомая у розных варыянтах і на Панямонні, і ў Цэнтральнай Беларусі, і Верхнім Падняпроўі) сядзіць на "залатым крэсле", у "чырвонай адзёжы", але ж ён "сакочыць", "жаніцца хочыць". І яму аддаюць у ахвяру дзяўчыну, "каторую хочаш", "хоць Ганульку маладую" [11, с. 168–172]. У гэтай гульні знайшлі сваё адлюстраванне сапраўдныя чалавечыя ахвяраванні Яшчуру, якія адбываліся ў нашых далёкіх прашчураў.

Чорту (яго іграе звычайна самы хударлявы і высокага росту хлопец), на якога "ажно глядзець *страшна*", даюць у рот палку, выгнутую накшталт люлькі, камечаць яго капялюш – словам, робяць з яго смешную карыкатуру [6, с. 495–496].

Амбівалентнасць (двухзначнасць) вобразаў і сімвалаў фальклорнага тэатра – неабходная іх якасць. Узгаданыя сімвалы і вобразы ў роўнай меры адлюстроўваюць як пачуццё, так і думку (пачуццёвыя думкі). І ў такім выпадку яны таксама двухзначныя, амбівалентныя, і патрэбныя, відаць, для таго, каб больш востра адчуць сябе і свет, у якім мы жывем, як адзінства і барацьбу супрацьлегласцей. К.Юнг набліжае нас да разумення сацыяльнага прызначэння ўзгаданых вобразаў фальклорнага тэатра. Ён піша, што вобразы (архетыпы) спантаннай творчай энергіі захопліваюць псіхіку чалавека "свайго роду спрадвечнай сілай і прымушаюць яе *выйсці за мяжу асабістага*" (курсіў наш.– *І.С.)*. Псіхолаг фармулюе асноўныя якасці ўзгаданых архетыпаў. Гэта – перабольшванне, раздутасць, надзвычайная апантанасць як у добрым, так і ў дрэнным [16, с. 251]. Дарэчы, менавіта пералічаныя якасці вылучае М.Бахцін для характарыстыкі вобразаў "народнай культуры" сярэднявечча і Рэнесанса [2].

Блізкасць архетыпаў калектыўнага падсвядомага і амбівалентных вобразаў фальклорнага тэатра праяўляецца і тады, калі сімвалы "начнога боку" чалавечай псіхікі называюць "міфалагічнымі". Вобразы і сімвалы калектыўнага падсвядомага павінны ўтрымліваць (і ўтрымліваюць!) супрацьлегласці, якія фарміруюцца ў міфалагічныя амбівалентныя вобразы.

У пэўных выпадках адзначаныя сімвалічныя формы не толькі фіксуюцца свядомасцю, але і набываюць там закончаную форму. Відаць, так нараджаліся мастацкія вобразы ў фальклоры. Тая частка духоўнага жыцця чалавецтва, якая адлюстроўвае міфалагічныя матывы ў амбівалентных вобразах і з пакалення ў пакаленне перадаецца вусна, у жніўні 1846 г. у лонданскім часопісе "Атэнэум" Уільямам Томсанам упершыню была названа фальклорам.

Самымі распаўсюджанымі ўзорамі спантаннай творчай энергіі ў фальклорным тэатры беларусаў, бясспрэчна, з`яўляюцца рознага роду духі. Прадстаўнікі "глыбіннай псіхалогіі" такія вобразы разумеюць як "маніфестацыі несвядомых комплексаў" [16, с. 250]. Першымі сярод такіх узораў спантаннай творчай энергіі ў беларусаў выступаюць духі бацькоў. Бацькі, якія непасрэдна на нас уплываюць, нараджаюць у нашым уяўленні вобразы, якія супадаюць з імі толькі часткова, часткова створаны з матэрыялу, узятага, як кажуць псіхолагі, "у самога суб'екта". Узгаданыя вобразы праецыруюцца падсвядома, і, калі бацькі паміраюць, спраецыраваныя вобразы працягваюць дзейнічаць, "як быццам яны былі самастойна існуючымі духамі" [16, с. 251]. Нашы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прашчуры гаварылі ў такім выпадку аб духах бацькоў, якія прыходзяць на святы ў хату, у першую чаргу на Дзяды.

Фальклор – міфалагічная субстанцыя. Цяжка ўявіць, што ўвогуле існавалі першабытныя людзі, якія нічога не ведалі аб "магічным дзеянні" або "магічнай субстанцыі". Думаецца, што беларусы ў дадзеным сэнсе не горшыя за іншых. Фальклорны тэатр беларусаў, здаецца, наскрозь прапітаны культам продкаў, пакланення духам і багам.

Наступным па значнасці ўзорам спантаннай творчай энергіі ў фальклорным тэатры беларусаў выступае архетып жаночага пачатку (аніма). Пануе думка, што мужчыне неабходна ў максімальнай ступені выціскаць жаноцкія рысы, таксама як для жанчыны (па крайняй меры да гэтага часу) лічыцца непрыстойным быць мужападобнай [12]. Але ж псіхолагі сцвярджаюць, што "няма мужчыны, які быў бы настолькі мужным, каб не меў у сабе нічога жаночага" [16, с. 254]. На справе хутчэй як раз вельмі мужным мужчынам (хоць і замаскіравана) уласціва вельмі пяшчотнае (часта не па праву называемае "жаноцкім") жыццё пачуццяў. Псіхолагі лічаць, што "жаноцкасць гэтага душэўнага комплексу тлумачыцца не толькі ўплывам жанчыны, але і ўласнай жаноцкасцю мужчыны. Больш таго, уся сутнасць мужчыны "дапускае жанчыну – як цялесна, так і духоўна". У пэўнай ступені тут ізноў ідзе размова аб узгаданай вышэй двухзначнасці, амбівалентнасці, уяўленняў. Сутнасць мужчыны накіравана на жанчыну і падрыхтавана для жанчыны, "як падрыхтаваны ён да гэтага Свету, дзе ёсць вада, паветра, вугляводы і г.д." Форма гэтага Свету, у якім ён (мужчына) народжаны, "дадзена яму як віртуальны вобраз" [16, с. 254].

Лагічна меркаваць, што ў падсвядомым мужчыны-беларуса таксама існуе перададзены яму па спадчыне калектыўны вобраз жанчыны, з дапамогай якога ён спасцігае прыроду жанчыны.

У фальклорным тэатры беларусаў з такім жаночым пачаткам мужчыны гледачы сустракаюцца вельмі часта. Даволі нагадаць пра тыя мужчынскія персанажы, якіх іграюць жанчыны (і не хаваюць гэтага). Асабліва часта з такімі персанажамі мы сустракаемся ў драматычных сцэнах вяселля.

Зразумела, першым носьбітам архетыпа жаночага пачатку з'яўляецца маці. Тое ж самае можна сказаць і аб архетыпе мужчынскага пачатку (анімус), носьбітам якога часцей за ўсё з'яўляецца бацька. У фальклорным тэатры беларусаў жаночых персанажаў, якія выконваюцца мужчынамі, таксама вялікае мноства. Менавіта ў такіх выпадках (калі жанчыну іграе мужчына і не хавае гэтага) глядач сустракаецца з адлюстраваннем архетыпа мужчынскага пачатку. Узгадаем, для прыкладу, пазаабрадавую гульню "Мар'юшка", а таксама шырокавядомых персанажаў, такіх як Папрадуха, Парадзіха і Павітуха [8, с. 2–12], ролі якіх у вясельных драматычных гульнях часцей за ўсё выконваюць мужчыны.

Яшчэ адным узорам калектыўнага падсвядомага з`яўляецца вобраз "цені" (архетып негатыўнай паловы раздвоенай асобы), а пазней (у хрысціянскай міфалогіі) – д'ябла (які з'яўляецца варыянтам "архетыпа цені, г.зн. небяспечнага аспекта непрызнанай, цёмнай паловы чалавека") [16, с. 143]. Калі быць па- слядоўным, то і гэты архетып амбівалентны. Ён таксама спалучае ў сабе маральныя супрацьлегласці дабра і зла. З персанажам Д`ябла, або Чорта, як варыянтам архетыпа цені ў фальклорным тэатры беларусаў можна сустрэцца даволі часта. Калі ўважліва разглядаць гэты вобраз, то ў ім без цяжкасці можна знайсці адлюстраванне ўзгаданай вышэй маральнай апазіцыі. У паказах батлейкі, напрыклад, Д`ябал – той персанаж, які разам з адмоўнымі выконвае станоўчую справу: ён труп Цара Ірада ўцягвае ў пекла. У адным з варыянтаў батлейкавага паказу на Магілёўшчыне гэты персанаж нават разлічвае на ўдзячнасць гледачоў:

...Сястра, удар яго
Сваёю касою!
Как зваліцца яго галава,
Нам будзе чэсць і слава! [14, с. 94]

Яшчэ адным сімвалам калектыўнага падсвядомага можна назваць "архетып мудраца" – першабытнага племяннога чараўніка, або лекара, асобы надзвычай таленавітай, якая валодае магічнай сілай. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што гэтыя якасці мае не індывідуальна-асабістая, а менавіта міфалагічная асоба, так званая "мана-асоба" [4], і яна гістарычна "развіваецца ў фігуру героя і Бога-чалавека, зямной выявай якога выступае жрэц" [16, с. 306]. Але гэта такі герой, якога дазваляецца кранаць, ён звычайны мудрэц, правадыр і бацька, фігура, якая валодае шматлікімі бясспрэчнымі якасцямі [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У фальклорным тэатры беларусаў такімі персанажамі можна назваць Каляднага дзеда, Павадыра казы, Купальскага дзядка. Кожны з узгаданых персанажаў – мудры, стары чалавек, часам жрэц, вяшчун, вясельны "стаўбавы" і інш. Разам з тым персанаж мае і адмоўныя (часам смешныя) рысы. Калядны дзед (або Павадыр казы) бывае апрануты вельмі непрыгожа – у старым кажуху, на адной назе ў яго валёнак, на другой – бот, ды яшчэ з адарванай падэшвай. Кій у руках у яго і той бывае крывы, сукаваты.

Прадстаўнікі глыбіннай псіхалогіі гэты "магічны" архетып бачаць яшчэ і як фігуру, якая ўяўляе нейкі негатыўны і, магчыма, небяспечны аспект, часцей "як цёмнаскурую асобу мангалоіднага тыпу" [16, с. 143]. Часам узгаданая фігура не адрозніваецца ад архетыпа цені. У фальклорным тэатры беларусаў падобным персанажам з'яўляецца Арап у народнай (каляднай) драме "Цар Максімілян" [13]. Тут неабходна падкрэсліць, што сярод яго атрыбутаў адзначаюцца і тыя, што прыпісваюцца Змею (пражэрлівасць, здольнасць выкідваць полымя і інш.). Яго ролю часцей за ўсё іграў кудзейнік [10], вымазаны сажай. З'яўляючыся перад гледачамі, Арап пырскаў на свечку шкіпінарам ці газай з роту, ад чаго пакой напаўняўся полымем .

Але і гэты архетып амбівалентны. У сістэме глыбіннай псіхалогіі ён – не толькі *негатыўная* фігура (цёмнаскурая, мангалоідная), але і *пазітыўны* вобраз (мана-асоба, вяшчун, мудрэц і інш.). Менавіта так і выглядае Арап. У першае імгненне ён з'яўляецца перад гледачамі як рыцар у даспехах і з вялізным мячом, нават як чараўнік, маг, які дыхае полымем. Разам з тым ён "арапскі каралеўскі сын". На паядынак з ім выходзіць Аніка-воін. Па традыцыі яны абменьваюцца турнірнымі прамовамі. У гэты ўрачысты момант Яўрэй б'е Арапа ззаду пантопляй і, што дзіўна, застаецца непакараным. Выходзіць, што ён адначасова і вельмі *моцны* рыцар каралеўскай крыві, і зусім *слабы* чалавек, няздольны супрацьстаяць нават небараку Яўрэю.

Яшчэ адным сімвалам калектыўнага падсвядомага можна назваць жывёлу, татэма. Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што змест калектыўнага падсвядомага ўяўляе сабой не толькі рэшткі архаічных, спецыфічна чалавечых спосабаў функцыянавання, але і рэшткі функцый шэрага жывёльных продкаў чалавека, працягласць існавання якіх як была больш доўгай у параўнанні з адносна кароткай эпохай спецыфічна чалавечага існавання. (Але, відаць, прырода гэтага архетыпа не генетычная, а міфалагічная.) У фальклорным тэатры беларусаў такіх сімвалаў калектыўнага падсвядомага шмат. Гэта Мядзведзь, Жораў, Каза, Кабыла, Тур. Спіс можна доўжыць. Кожны з іх спалучае ў сабе тыя або іншыя пары маральных супрацьлегласцей. Тут, здаецца, прыклады не патрабуюцца, але адзін – узгадаем.

Самы распаўсюджаны татэмны персанаж фальклорнага тэатра беларусаў Каза. Яна не толькі галоўная дзеючая асоба калядаванняў, але і шматлікіх гульняў, ігрышчаў, іншых фальклорных паказаў. Нават у батлейцы Антон ходзіць з Казой [1, с. 128–129]. Яно і зразумела:

... А й дзе каза з рогам,  
Там жытушка стогам;  
І дзе каза з хвастом,  
Там жыта кустом... [7, с. 318].

Такім чынам, выходзіць, што Каза (або Казёл) – носьбіт багацця, тая міфалагічная істота, якая *прыносіць* шчасце і дабрабыт у сям`ю. Але разам з тым яна *зносіць* з хаты якую-небудзь рэч. Звычайна пасля заканчэння песні ў яе гонар Каза кладзецца на падлогу збоку або на лаўку і імкнецца чым-небудзь пажывіцца, што-небудзь украсці ў гаспадароў. Па традыцыі гэтыя шкодныя дзеянні ёй даравалі.

Наступныя ўзоры спантаннай творчай энергіі ў прадстаўнікоў глыбіннай псіхалогіі – архетыпы мэты, чацвярцічнасці і круга. Яны, на іх думку, выражаюць "мэту (або мэты) працэсу развіцця" [16, с. 160–161]. У фальклорным тэатры беларусаў сімвалы чацвярцічнасці і круга сустракаюцца на кожным кроку. Амаль любая гульня, шмат карагодных ігрышчаў праводзяцца ў крузе: персанажы рухаюцца або па сонейку, або супраць яго.

Яшчэ адным сімвалам калектыўнага падсвядомага можна назваць архетып Бога. Гэта аўтэнтычны, сапраўды першабытны, "поўнасцю калектыўны вобраз, этнічнае быццё якога нам даўно вядома" [16, с. 191].

У фальклорным тэатры беларусаў глядач сустракаецца з выявамі вялікага мноства язычніцкіх духаў і багоў. Часта яны спалучаюць у сабе дабро і зло, вялікае і нізкае, сур'ёзнае і смешнае. Узгадаем Жыжаля – язычніцкага бога агню. На Міншчыне старыя людзі яго дагэтуль вельмі паважаюць. Разам з тым пра яго можна пачуць: "Жыж унадзіўся" або "Няўмычны, як Жыж", гэта значыць неадчэпны, прыліплівы [9, кн. 4, с. 93–94]. Дарэчы, больку на губе людзі называюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыжкай. Тое ж самае можна сказаць і пра Змея, які не толькі *носіць* грошы, але і *помсціць* пажарам. Амбівалентным з'яўляецца і вобраз язычніцкага духа восені Жыценя. Пра яго кажуць: “Жыцень з кобзай (шчыпковы струнна-музычны інструмент. – *І.С.*) – голад на двор” [9, кн. 4, с. 93–94]. Выходзіць, што *вясёлы* дух прыносіць *гора*. Добрае і злое спалучае ў сабе, здаецца, усім вядомы міфалагічны персанаж Ох, які жыве пад зямлёй. Калі хто, будуючы дом, уздыхне ды скажа: “Ох!” – то ён выйдзе са свайго жытла і абавязкова спытае: “Чаго патрабуеш?” Вядома, напалохаешся. “А як хто гэта ведае… дый скажа яму, чаго хочаш, то ён яму тое і дасць” [15, с. 236].

Такім чынам, узоры калектыўнага падсвядомага, як вобразы і сімвалы спантаннай творчай энергіі (архетыпы), сустракаюцца і ў духоўнай культуры беларусаў. Адзін і той жа персанаж можа быць амбівалентным – і разумным, і дурным, і добрым, і злым адначасова. Татэмныя жывёлы (Тур, Каза, Мядз-ведзь), міфалагічныя персанажы (Яшчур), язычніцкія багі (Жыжаль, Жыцень), рознага роду духі (Ох), архетыпы жаночага (Папрадуха, Парадзіха) і мужчынскага пачатку (Князь-князевіч, Дзедушка Мазоль, Барада), архетыпы чараўніка, мудраца (Валхвіст, Купальскі Дзед, Стаўбавы), лекара – усе яны адлюстроўваюць змешчаныя ў калектыўнай псіхіцы, штучна ўсвядомленыя або зразумелыя праз пачуцці апазіцыі, "пары маральных супрацьлегласцей".


1. *Барышаў Г.І., Саннікаў А.К.* Беларускі народны тэатр батлейка. – Мн.: Выд-ва Мін-ва вышэйш., сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962.

2. *Бахтин М.М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса. – 2-е изд. – М.: Худож. лит., 1990.

3. *Гл.: “Галем”* Густава Майрынка. Тыбецкі чараўнік (вядзьмар) у яго “Кажанах” магічным чынам распачаў сусветную вайну. Тып чараўніка сустракаецца ў Заратустры. У “Фаўсце” ён таксама галоўны герой.

4. *Гл.: Советский* энциклопедический словарь. – 3-е изд. / Гл. ред. А.М.Прохоров.– М.: Сов. энциклопедия, 1985. – С. 753. У вераваннях шматлікіх народаў мана-асоба – звышнатуральная сіла, якая належыць не толькі некаторым людзям, але жывёлам, рэчам і духам.

5. *Дембовецкий А.С.* Опыт описания Могилевской губернии под редакцией председателя губернского статистического комитета А.С.Дембовецкого. – Могилев, 1882. – Кн.1.

6. *Гусев В.Е.* Эстетика фольклора. – Л.: Наука, 1967.

7. *Дзіцячы* фальклор / Склад. Г.А.Барташэвіч; Склад. муз. часткі В.І.Ялатаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972.

8. *Добровольский В.Н.* Смоленский этнографический сборник. – СПб.: [Б.и.], 1903. – Ч. 4. (Зап. у м. Свалы Смаленскага павета.)

9. *Древлянский П.* Белорусские народные поверья // Прибавления к Журналу Министерства народного просвещения. – СПб., 1846.

10. *Кудзейнік* – чалавек, які займаецца "прыгожым мастацтвам". Гл.: *Ластоўскі В.* Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. – Коўна: Выд. А.Бака, 1924. – С. 11. Тэрмін, які тут выкарыстоўваецца намі, на нашу думку, адпавядае сутнасці выканаўчай дзейнасці ў фальклорным тэатры беларусаў, дзе кожны выдатны творца – не толькі майстар тэатральнага дзеяння, але і музыка, і спявак, і танцор.

11. *Народны* тэатр / Уклад., уступ. артыкул і камент. М.А.Каладзінскага. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983.

12. *На ўзгаданую* тэму існуе шмат твораў, пералік якіх можна пачаць з Тацыта. Гл.: *Tacitus.* Germania. – Paragr. 18, 19; *Haggard* Rider. She. – 1887; *Benoit* Pierre. L’Atlantide. – 1919.

13. *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. – Витебск: [Б.и.], 1891. – Вып. 5. – С. 273 – 283.

14. *Романов В.Е.* Белорусский сборник. – Вильно: [Б.и.], 1912. – Вып. 8 – 9.

15. *Czarnowska M.* Zabytki mitologii sławiańskiej w zwyczajach wiejskiego ludu na Białej Rusi dochowywane // Dziennik Wileński. – 1817. – T. 2 (№ 34).

16. *Юнг К.Г.* Психология бессознательного / Пер. с нем. – М.: Канон, 1994.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ